# УВОДЗІНЫ

*А вернем славу, вернем і дзяржаву,*
*Бо з парастка пачатак дрэва волі.*
*А. Міцкевіч*

Мы жывем ў дваццаць першым стагоддзі. Новы час нясе новыя з’явы, падзеі, рэчы, прылады... Штосьці з’яўляецца, штосьці знікае. І гэта непазбежна... Але дзеці гулялі, гуляюць і будуць гуляць з цацкамі. Напярэдадні зімовых святаў намі быў праведзены апыт у 1-5 класах нашай школы, які паказаў, што ў першых класах 63% з апытаных дзяўчынак жадаюць, каб Дзед Мароз падараваў ім ляльку. Прычым, у 25% – гэта лялька-гераіня замежных мультфільмаў, а астатнія 12% – лялька ў выглядзе немаўля.  Канешне, у 5 класе гэты паказчык зніжаецца (толькі 22% дзяўчат папрасілі ляльку), бо пераважаюць тэлефоны і розныя гаджэты. А з якімі лялькамі гулялі нашы продкі, калі не было пластмасы, фарфору, Барбі, Вінкс і г. д. Такім чынам, бачым, што тэма работы “Традыцыйнаям лялька” абрана невыпадкова. Яна ўзята з мэтай даследавання гісторыі паходжання лялькі, вызначэння відаў лялек і ролі іх у жыцці беларусаў. У ходзе работы трэба вырашыць шэраг задач:

- ✔ аднавіць гісторыю паходжання народнай лялькі,
- ✔ выявіць віды народнай лялькі ў залежнасці ад яе прызначэння,

Для вырашэння гэтых задач выкарыстоўваліся наступныя метады: апісанне, класіфікацыя, гутарка, аналіз, анкетаванне вучняў.

Дадзеная праца – гэта вынік часу, праведзенага над вывучэннем спецыяльнай літаратуры і рэсурсаў інтэрнету, наведвання музея этнаграфіі “Млын”, у гутарцы з вучнямі школы.

## ЧАСТКА 1. Гісторыя паходжання лялькі

Ва ўсе часы для дзяцей майстравалі лялькі. Гісторыя сведчыць, што ў вёсках з другой паловы XIX стагоддзя самай распаўсюджанай цацкай сярод дзятвы была лялька, зробленая з тканіны. Іх бераглі, перадавалі з пакалення ў пакаленне. Гулялі ў лялькі да 7-8 год усе дзеці. Але толькі хлопчыкі пачыналі насіць порты, а дзяўчаты спадніцу, іх гульнёвыя ролі раздзяляліся. Пакуль дзеці былі  маленькімі, лялькі ім шылі матулі, бабулі, старэйшыя сёстры. З пяці год ляльку-пелянашку магла зрабіць любая дзяўчынка. Уменні дзіця ацэньвалі дарослыя.

Лялькі розных рэгіёнаў Беларусі пры знешнім адрозненні блізкія па спосабе вырабу. Тканіну згортвалі да ўтварэння слупападобнай скульптуркі (адсюль і назва

лялек – згортышы). Цела лялькі перацягвалі ніткай або стужкай на месцы шыі і пояса. Цела дзялілася на 3 часткі. Лічыцца, што гэта сімволіка трыадзінага свету: верхняга (неба), ніжняга (падземнага) і сярэдняга (зямля і чалавек на ёй). Лялькі-куваткі перацягваліся па тым жа прынцыпе, але мелі яшчэ і рукі, таму былі падобны на крыжыкі: знешне мелі 4 напрамкі. Такім чынам, у самой канструкцыі ўтрымліваецца лік 7 – сімвал Сусвету. Пасля стварэння асновы лялькі яе апраналі. Для вырабу вопраткі лялькі найчасцей выкарыстоўвалі тканіну са старога адзення (падолы жаночых сарочак, фартухі). І не толькі з-за беднасці, а згодна з рытуалам кроўнага радства. Лічылася, што лялька, вырабленая з такой тканіны, можа стаць абярэгам дзіцяці. Ляльку не шылі (каб жыццё было “не рэзанае і не колатае”), а закручвалі і перавязвалі ніткамі. Убранне для лялькі можна было вышыць, падшыць да яго карункі, упрыгожванні, пакуль ён не быў прымотаны. Твару ў лялькі не было таму, што лічылася, быццам праз яго ў ляльку могуць пранікнуць злыя духі. Часам на месцы твара рабілі крыж – як сімвал жыцця і сонца. Пачатую ляльку абавязкова трэба было закончыць, каб не было бяды. Па якасці вырабу лялькі рабілі вывад, ці гатова дзяўчына да замужжа. Самыя прыгожыя  лялькі захоўваліся ў куфрах і былі часткай пасагу.

## ЧАСТКА 2. Пазаабрадавыя лялькі

Усе дзіцячыя лялькі адначасова з’яўляліся абярэгавымі, якія павінны рабіцца без іголкі. Іх майстравалі з рэшткаў саломы, тканіны. У сялянскай хаце нічога задарма не страчвалася. Але былі і проста гульнёвыя лялькі, з якімі забаўляліся дзеці.

**Пелянашка.** Гульнёвая дзіцячая лялька. Для немаўлят маці рабіла «пелянашку». Лялька шылася непасрэдна перад нараджэннем дзіця, з малітвай, з думкамі аб будучым малога; тканіну для вырабу бралі ад старога адзення, бо яно захоўвала радавую і генетычную памяць. Лялька ўкладвалася ў далоньку і, сціскаючы кулачкі, малы сам сабе рабіў масаж ўсёй унутранай паверхні далонькі.

**Стрыгушка.** Самая распраўсюджаная дзіцячая гульнёвая лялька, рабілася яна са стрыжанай травы. Калі жанчына ішла ў поле, яна брала дзіця і, каб той  мог забаўляцца, рабіла яму ляльку з травы. Часта такую ляльку выкарыстоўвалі з лекавымі мэтамі, калі дзіця хварэла, то такую ляльку рабілі з лекавых зёлак.

**Зайчык-на-пальчык.** Сябра і абярэг дзецям. Зайчык надзяваецца на пальчык і заўсёды побач. Гэту ляльку бацькі давалі дзецям, калі ішлі з хаты.

**Малышок – галышок.** Адрознівалася тэхнікай стварэння. Тканіну ўнізе не пакідалі адзіным "падолам", а раздзялялі на дзве часткі і рабілі ножкі, абмотвалі іх ніткамі. "Малышок" был голенькі, без вопраткі, але пояс быў абавязковым, бо з'яўляўся моцным абярэгам.

**Суцешніца.** Ляльку робяць абавязкова з матчынага падолу і захоўваюць у хаце да тае пары, пакуль яна не зносіцца ўшчэнт і не распадзецца. Змалку дзіця звыкаецца, што ўсе крыўды можна пераказаць адмысловай ляльцы, і яна пашкадуе і дапаможа. І Суцешніца сапраўды "зберагае" суцеху – цукерынку, пернік ці што з садавіны – на супакаенне жалю. Яе даставалі, і калі малое пачынала капрызіць. Выгляд жа лялькі-прыгажуні – багата апранутай, аздобленай малюсенькімі цукеркамі або пернікамі, – адразу ж прымушаў плаксу забыцца пра слёзы.

**Стаўбушка "Палена".** Уяўляла драўлянае палена, апранутае ў стылізаванае жаночае адзенне. Пазней сталі рабіць са скручанай тканіны.

**Адарка (аддараная).** Лялек выраблялі для набыцця ў гульні ўмельства ды запамінання асноўных прынцыпаў незвычайнага рамяства. Ужо з двух гадоў дзяўчынка рабіла самыя простыя лялькі назамен падарункаў, што прыносілі ёй госці.

**Лялька Навыхвалка.** З'яўлялася гульнёвай сшыўной лялькай. Яна шылася дзяўчынкамі гадоў 12 і была экзаменам па ўмельству. Сваіх Навыхвалак дзяўчаты надзявалі на руку і хадзілі па вёсцы, пасля прагулкі ставілі на акенца ў хаце. Такая лялька ў акне азначала, што да дзеўкі можна засылаць сватоў. А пра тое, якая майстрыха ў хаце, яны меркавалі па сукенцы Навыхвалкі.

**Лялька Каша.** Маці ці бабуля, а можа, і старэйшая сястра 7–8-гадовай дзяўчынцы рабілі Кашу. Гэта была лялька-мерка, падобная на мяшочак – яе перавязвалі чырвонымі ніткамі ў асаблівых месцах, якія былі для будучай гаспадынькі мернымі рыскамі. Лялька Каша рабілася пад чыгунок, дзе звычайна маці варыла кашу, каб дачушка сама навучылася яе ў печы гатаваць. Малая ставіла ляльку каля чыгунка і прыгаворвала: "Крупы насыпай па калена, вады налівай па пояс, а кашы атрымаеш па горлачка".

**Жаданіца.** Абярэгавая лялька. Паказваць яе нікому нельга было. Кожны раз, калі ў Жаданніцы нешта прасілі, ёй рабіўся падарунак – яе сукенка ўпрыгожвалася

новай лентачкай, бусінай, высушанай ягадай. Ляльку падносілі да вады, пазней – да люстэрка: “Глядзі, якая ты прыгожая, за гэта выканай маё жаданне”.

**Дзеўка-баба.** Гэта гульнёвая лялька рабілася дзяўчынай для асэнсавання розніцы паміж дзяўчынай і замужняй жанчынай. Лялька была з аднаго боку дзяўчынай, а з другога – жанчынай-маці, бабай.

## ЧАСТКА 3. Абрадавыя (каляндарна-абрадавыя і сямейна-абрадавыя) лялькі

Калі ж зазірнуць у гісторыю лялькі, можна знайсці шмат цікавага. На працягу многіх стагоддзяў яна з'яўлялася часткай народнай культуры. І ў ёй ляльцы адводзілася сакральная роля. Дадзеную адметнасць захавалі казкі, у сюжэце якіх дзейнічае лялька. Часцей за ўсё яна дапамагае галоўнай гераіні (звычайна гэта сірата) перажыць гора, ахоўвае ад усяго злога. Такім чынам, лялька ў народнай традыцыі ўспрымалася як абярэг.

У каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў лялька – досыць распаўсюджаная з’ява. Яна суадносіцца з аднаго боку з маленькімі дзецьмі, немаўлятамі, а з другога боку з родам, дзядамі, што не адмаўляе адно другое, а хутчэй дапаўняе, бо ў беларускай традыцыйнай культуры дзіця ўспрымаецца як пасланец іншага свету, свету продкаў, з якім яно доўгі перыяд застаецца звязаным. Таму не ўсе лялькі, што выраблялiся нашымі продкамі, былі прызначаны для гульні. Сярод іх былі лялькі абрадавыя і абярэгі, праз якія дзеці знаёміліся з укладам жыцця і атрымлівалі маральныя, сімвалічныя і міфалагічныя веды. Гэта не проста цацкі.

Каляндарна-абрадавыя лялькі, падобныя на слуп ці крыж, шырока распаўсюджаны на Беларусі ў масленічным, русальным, купальскім абрадах. У канструкцыі гэтых лялек выразна падкрэсліваецца ідэя плоднасці, якая абыгрываецца падчас абраду, а іх рытуальнае пахаванне ўзмацняе сувязь з памерлымі продкамі.

**Масленіца.** На Масленіцу спальваюць саламяную ляльку-пудзіла Зімы. Але мала хто здагадваецца, што яшчэ адным з абавязковых атрыбутаў гэтага свята з’ўляецца хатняя лялька Масленіца. Лялька Масленіца – гэта хатні абярэг, які робяць сваімі рукамі са шматкоў тканіны, саломы, бяросты. Лічыцца, што зробленая ў добрым настроі і з добрымі намерамі, лялька Масленіца прынясе ў дом сямейны дабрабыт і здароўе. Дзеці гулялі ў яе адзін тыдзень, а потым, у Даравальную

нядзелю, калі спальвалі велізарную саламяную Масленіцу, туды ж кідалі гэтую ляльку.

**Марцінічкі.** Гуканне вясны не абыходзілася без лялек-марцінічак: рабілі іх з нітак і вешалі на галіны дрэўца, вакол якога вадзілі карагоды і клікалі вясну. Прычэпліваліся да вопраткі і насіліся да першага ўбачанага бусла альбо да канца сакавіка. Потым загадвалася жаданне і марцінічкі вешаліся на галінку маладога дрэўца. Лялек вязалі парамі з белых нітак – сімвал уходзячай зімы, і з чырвоных – сімвал вясны і сонца.

**Лялька-Каляда.** У некаторых мясцінах Беларусі 21 студзеня ладзілі абрад “Цягнуць Каляду на дуба”. Дзяўчаты і ўсе жадаючыя рабілі абрадавую ляльку –Каляду. Яе прымацоўвалі на драўляную, увабраную стужкамі барану, а маладыя хлопцы ўзнімалі яе на высокае дрэва, каб сядзела Каляда высока і садзейнічала багатаму ўраджаю.

**Русалле і Купалле.** У некаторых вёсках выкарыстоўвалі русалку-пудзіла, яе рабілі зануч і саломы і апраналі ў жаночую вопратку. Часам гэта была ссечаная бярозка, апранутая як дзяўчына, упрыгожаная кветкамі і стужкамі. Тады тое пудзіла або дрэўца напрыканцы абраду або «палілі», або «тапілі», або «закопвалі”, “хавалі».

У канцы абраду ляльку-русалку часцей за ўсё ўкідалі ў жыта ці тапілі, але маглі таксама падпаліць, а тады ўкінуць у ваду. Купальскія ж лялькі найчасцей былі зроблены на аснове палкі і іх спальвалі на рытуальным вогнішчы.

Лялькі такога тыпу выкарыстоўваюцца на Гомельшчыне і ў веснавым абрадзе “Пахаванне стралы, для якога з ануч, лапікаў тканіны, засушаных лячэбных траў, каласкоў вырабляюць ляльку-стралу, якую кладуць у каробку-труну і спяваючы-галосячы хаваюць у полі, каб не было засухі, ішлі дажджы і не пасохла жыта, а таксама каб засцерагчы вёску ад маланкі, навальніцы.

Некаторыя жанчыны старэйшага пакалення і зараз узгадваюць, што на Ушэсце закопвалі ў полі ляльку з лапікаў крамнай тканіны. Стараліся пакласці ў ямку манеты або іншыя бліскучыя ці металічныя прадметы − брошку, пярсцёнак, завушнічку, а цяпер кідаюць і папяровыя грошы. Над месцам пахавання лялькі завязваюць з чатырох бакоў пук каласкоў.

**Дажынкавы сноп (“барада”).** Своеасаблівымі лялькамі з’яўляюцца зажынкавыя, часцей дажынкавыя снапы (“барада”), якія ўвасаблялі сабою дух поля і

забяспечвалі ўраджай наступнага году. Яны таксама называліся “баба”, “дзед”, “дзедава барада”, “дзеду на бараду”, “дзяды”, “Богава барада”, “кукла”, “рай”, “каза” і інш. Хлеб-соль лажылі, каб зямлі падзякаваць, што дала ўраджай.

**Лялька Кузьмы-Дзям’яна** Увосень, на св. Кузьму-Дзям’яна, што спрыялі, паводле народных уяўленняў, вяселлям, рабілі ляльку Кузьмы-Дзям’яна. Чучала “апраналі ў мужчынскую вопратку, садзілі гэтага «хлопца» на пачэснае месца за сталом, частавалі яго і частаваліся самі. Побач з пудзілам садзілася дзяўчына і іх «жанілі, гулялі вяселле», падчас якога гучалі жарты і прыпеўкі эратычнага зместу. У канцы вячорак хлопцы выносілі пудзіла за вёску, здымалі з яго адзенне, а салому спальвалі. Да таго ж прасочваецца сувязь Кузьмы-Дзям’яна з вобразам пячнога слупа, якога яшчэ называлі “гаспадар”, “хазяін”, “дзядзька”, “дзед”, “конь”, а таксама хатнікам і хатнім агнём. Менавіта седзячы на пячным слупе “стаўбавы” звяртаўся да Кузьмы-Дзям’яна на пачатку вяселля, каб “скаваць свадзебку”. Пячны слуп таксама ўяўляўся як адно з месцаў пражывання хатніка, цесна звязанага з уяўленнямі аб продках і дабрабыце сям’і.

Такім чынам, можна казаць аб тым, што лялькі ў святочнай абраднасці беларусаў суадносяцца з традыцыйнай міфалогіяй і ў народнай свядомасці з’яўляюцца своеасаблівымі прадметамі-медыятарамі, пасрэднікамі паміж гэтым і тым светам, якія семантычна звязаныя з плоднасцю, урадлівасцю, багаццем і як увасабленні духаў продкаў яны спрыяюць роду на гэтым свеце, дапамагаюць і зямлі, і людзям радзіць, сімвалізуюць жыццёвыя патэнцыі, што ўвасабляецца ў іх канструкцыі, матэрыялах і спосабе выкарыстання.

## Сямейна – абрадавыя лялькі

Моцна трымаецца беларус даўніх, прадзедаўскіх звычаяў, даўно ўжо забытых іншымі народамі. Свята верыць у магічную і сакральную сілу рэчаў, так як і продкі яго калісьці верылі. А гэтыя рэчы акружалі нашых продкаў на кожным кроку ў іх паўсядзённым жыцці. Адмысловая ахоўная роля адводзіцца засцярогам у самым пачатку жыцця чалавека.

**Ён і Яна (Манька й Ванька).** Сярод сямейна-абрадавых лялек, падобных на цела дарослага чалавека, вылучаюцца таксама і вясельныя лялькі (абрадавая), якія рабіліся да розных момантаў вяселля. Вясельныя лялькі: Ён і Яна (Манька й Ванька) – саламяныя лялькі-абярэгі, што сімвалізуюць суджаных.

**Лялька “Сусветнае дрэва”.** У вясельны каравай устаўлялі рагаціну (акрамя вольхі і асіны, бо гэтыя дрэвы звязваліся з нячыстай сілай) з гэтымі лялькамі, якія пазней захоўваліся ў чырвоным кутку пад іконай як сямейны талісман. Лялька “Сусветнае дрэва” (абрадавая) дорыцца маладым на вяселле.

**Лялькі “Неразлучнікі”.** Маладой пары на шлюб дарылі “неразлучнікаў” – пару лялек з адной агульнай рукой, на якую пазней падвешвалі лялек-дзетак. У Зборную суботу сяброўкі па традыцыі дораць дзяўчыне напярэдадні замужжа Суцешніцу з матулінага падолу і Дзесяціручку. На вяселлі часта маладой на калені падкладалі Спавівачку-Пелянашку, а пад ложак маладым – Згортыша-Закрутку.

**Дзесяціручка.** Лялька-таёмка, што падмагае гаспадыні паспяваць усё перарабіць: на кожную руку загадвалася нейкая сфера гаспадарчай дзейнасці, у якой магла паспрыяць лялька. Дзесяціручку рабілі з падлеткавага ўзросту дзяўчынкі на падмогу самім сабе альбо маці – дачцы (у побыце ці да даччынога замужжа).

**Кувадка.** Да вадохрышча над зыбкай падвешвалі няцотную колькасць лялечак, зробленых з аднатоннага каляровага матэрыялу, вельмі яркіх, каб прыцягнуць увагу дзіцяці. Яны зваліся кувадкі (абярэгавая лялька). У звязку звычайна бывала ад 3 да 5 такіх лялячак. Сваю назву яны атрымалі ад абраду “кувады”, які злучаны з таемствам нараджэння дзіцяці. Бацьку дзіцяці ў гэтым абрадзе адводзілася актыўная роля. У прылазніку выстаўлялі кош з курынымі яйкамі. Мужчына садзіўся на кош, робячы выгляд, што выседжвае яйкі (па павер’ях, яйка з’яўлялася першаасновай жыцця). Гучнымі апантаннымі крыкамі, пераймаючы крыкам парадзіхі, мужчына выманьваў злых духоў у прылазнік. Каб ашуканыя і разззлаваныя духі не вярнуліся да парадзіхі, у прылазніку развешвалі лялькі-кувадкі. Верылі, што ў гэтыя першыя трапіўшыя на вочы неадушаўлёныя выявы людзей і ўсяляліся злыя духі. Пасля абраду ачышчэння ад брыдоты гэтыя лялькі спальвалі.

**“Зернавушка” або “крупенічка”.** Абярэгавая лялька. Пасля ўборачных работ сяляне адбіралі самае лепшае зерне новага ўраджаю, каб напоўніць ляльку-мяшэчак. Ляльку захоўвалі да наступнага года ў чырвоным куце. “Зернавушкі” аберагалі сям’ю ад голаду і дапамагалі перажыць зіму. Вясной самым першым у зямлю ішло зерне з мінулагодняй “зернавушкі”, а ў канцы года рабілі новую.

**Папялушка.** Адна з найстаражытнейшых абярэжных лялек. Увасабляе дух продкаў, які апякуецца над родам. Рабілі яе з попелу, узятага з печы і ачага. Попел

разводзілі вадой і фармавалі галаву лялькі. Лічылася, што Зольная лялька беражэ памяць роду, дапамагае яго захаванню і памнажэнню. Папялушку стваралі і да вяселля як падарунак маладым.

**Багатуха.** Абярэгавая лялька. Гэтую ляльку пладавітасці, росквіту, памнажэння і пабагачэння роду заўсёды стварала маці. І выглядала лялька як шматкампанентная кампазіцыя: да асноўнай, большай, постаці прывязваюць пасам маленькіх лялянят-дзетак. Ляльку дарылі на вяселле: падчас вясельнай цырымоніі маці адрывала маленькіх лялек ад вялікай і перадавала маладым – на прыплод, зачын здаровых нашчадкаў і дабрабыт. Вялікая лялька заставалася ў бацькоўскай хаце як стрыжань моцы роду. Яе ставілі высока на шафу ці паліцу і ніколі не давалі ў рукі чужакам.

**Скарбонка-Траўніца.** У яе закладзены розныя лекавыя зёлкі, якія кожны год трэба замяняць. Яна і абярэг хаты, і супакаяльнік, і падможніца ад бяссоння, і валодае ачышчальнымі якасцямі (залежна ад таго, якія зёлкі ў ёй змешчаны).

**Спірыдон-Сонцазварот.** Робіцца, каб выклікаць у жыцці жадаемыя перамены. Лічыцца, што Спірыдон-Сонцазварот паваротам кола можа змяніць жыццё ў патрэбны бок. Лялька "ўдзельнічае" ў планетарнай сонцазваротнай містэрыі і прымяркоўваецца зазвычай да сонцазвароту зімовага, каляднага.

## Заключэнне

Сучасная прамысловасць выпускае мільёны лялек. Гэта, у сваю чаргу, паспрыяла таму, што традыцыя стварэння лялькі ў сем'ях згасла. Магчыма, гэта звязана і з недахопам саміх матэрыялаў, бо абрадавыя лялькі часцей за ўсё знішчаліся падчас абраду (спальваліся, тапіліся, закопваліся, разбіраліся), а лялькі для гульні асабліва не захоўваліся ў сем'ях, бо былі недаўгавечныя і заўсёды можна было хутка і проста з падручных матэрыялаў зрабіць новую цацку.

Лялька – дзіўнае стварэнне, у якім закладзены вялікі сэнс, магчыма, таму знікнуць ёй не ўдалося, бо захавалася ў народнай памяці.

А ці агароднае пудзіла не абярэг, што аберагае пасевы? Такія лялькі і сёння можна ўбачыць. І часты атрыбут сучаснага вяселля − прыгожая лялька на капоце вясельнага аўтамабіля − адгалосак менавіта таго старадаўняга абраду? Мабыць, таму з 2010 года 16 лістапада адзначаецца як беларускае дзяржаўнае свята – Дзень

беларускай лялькі. Гэтае свята старажытнае, карані яго ўходзяць, відаць, яшчэ ў першабытны час. На шчасце, карані не загінулі.

Такім чынам, падводзячы вынікі нашай даследчай работы, можна адзначыць, што мы прааналізавалі розны матэрыял па тэме і вызначылі гісторыю паходжання лялькі, выявілі віды лялек і ролю іх у жыцці беларусаў, зразумелі, што лялькі, як знакі-сімвалы, неслі ў сабе вялікую інфармацыю, маглі замяніць каляндар, служылі абярэгамі і выконвалі шмат іншых роляў у жыцці чалавека і грамадства.

## Спіс літаратуры


1. Кухаронак, Т.І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т.І. Кухаронак. - Мінск: Ураджай, 2001. – 239 с.
2. Народны тэатр / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Уклад. і камент. М. А. Каладзінскага; Уступ. арт. А. С. Фядосіка; Рэд. выд. А. С. Фядосік, А. В. Сабалеўскі. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 554 с.
3. Этнаграфія Беларусі: энцыклапедыя / [навук. канс.: М.В. Біч і інш]. – Мінск: БелСЭ, 1989. – (Беларуская савецкая энцыклапедыя).
4. Краязнаўчы сайт Гомеля і Гомельшчыны [Электронный ресурс] / “Пахаванне стралы” – рэгіянальна-адметная абрадавая з’ява фальклору Ўсходняга Палесся (ч. першая). – Гомель, 2008-2009. – Рэжым доступу: http://www.nashkraj.info. – Дата доступу: 22.02.2011.

5. «Пахаванне стралы» – рэгіянальна-адметная абрадавая з’ява фальклору Усходняга Палесся (ч. 1) [Электронны рэсурс]. – Гомель, 2008–2009. – Рэжым доступу: http: //www.nashkraj.info. – Дата доступу: 22.02.2011.